рекомендаций санитарных норм и правил, инструктивно-методического письма Министерства образования Республики Беларусь.

Образовательный процесс характеризуется применением современных педагогических технологий, развитием нетрадиционных направлений работы с детьми, взаимодействием специалистов и воспитателей дошкольного образования, обеспечением интеграции разных видов деятельности. При этом используются групповые, подгрупповые и индивидуальные формы работы, предпочтение отдаётся игровым методам и приёмам.

Изучение качества образовательного процесса свидетельствует о том, что педагоги реализуют основное содержание образовательной программы и систему представленных в ней задач посредством различных видов деятельности. Анализ качества образовательного процесса через посещение и просмотр занятий, беседы с руководством и педагогами позволил сделать выводы, что педагогами выполняются основные требования к организации образовательного процесса в соответствии со ст. 91 Кодекса Республики Беларусь об образовании, обеспечивается компетентностный подход, созданы безопасные условия жизнедеятельности. Содержание деятельности с детьми эмоционально насыщено, педагоги владеют методикой проведения занятий, используют методы и приёмы, позволяющие эффективно решить поставленные задачи, соблюдаются здоровьесберегающие компоненты. Педагоги моделируют образовательный процесс с учётом возрастных и индивидуальных особенностей детей. Специально организованная деятельность строится на основе доброжелательного взаимодействия с детьми, умения педагогов поддерживать интерес ребёнка к деятельности.

Планирование образовательной работы педагогов отражает структуру плана реализации образовательного процесса в группах раннего и дошкольного возраста, предлагаемого инструктивно-методическим письмом Министерства образования Республики Беларусь. Содержание образовательного процесса строится на основе тематического планирования, учебной программы и возрастных особенностей детей. Планирование деятельности осуществляется с использованием учебных изданий, утвержденных либо допущенных в качестве соответствующего вида издания Министерством образования Республики Беларусь.

**Заключение.** Изучение деятельности показало, что работа в государственном учреждении образования «Ясли-сад № 14 г. Сморгони» организована в соответствии с Кодексом Республики Беларусь об образовании, Положением об учреждении дошкольного образования и направлена на обеспечение выполнения всеми субъектами образовательного процесса законодательных актов в области дошкольного образования, повышение его качества и доступности. Результаты онлайн анкетирования педагогического коллектива показывают, что 100 % педагогов удовлетворены уровнем мобилизации коллектива со стороны руководства по обеспечению устойчивого функционирования и развития учреждения, согласованностью действий руководства, условиями работы, информированностью о состоянии дел в коллективе, стилем руководства заведующего, заместителя заведующего по основной деятельности; 96,4 % — режимом работы и внутренним распорядком, психологическим микроклиматом в коллективе, графиком работы; 89,3 % — системой материального поощрения. Итоги анкетирования свидетельствует о том, что в коллективе созданы условия для качественной организации образовательного процесса.

Основой управления и важной стадией управленческого цикла является планирование и прогнозирование для определения зон ближайшего и перспективного развития учреждения дошкольного образования в определённых условиях окружающей среды и на основе педагогического анализа.

**Список цитируемых источников**

1. *Лобынько, Л. В.* Контроль и анализ деятельности учреждения дошкольного образования / Л. В. Лобынько. — Минск : ИВЦ Минфина, 2014. — 320 с.

УДК: 373.2.091.12 + 373.2.014.6

**Трухановіч Марыя Эдуардаўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», Мінск, Рэспубліка Беларусь, marie29a@yandex.ru*

## МАТЫВАЦЫЙНА-КАШТОЎНАСНАЕ СТАЎЛЕННЕ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ ДА НАЦЫЯНАЛЬНА-МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ ЯК АСНОЎНАЯ ЎМОВА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЯЕ ЯКАСЦІ

У артыкуле ўздымаецца праблема матывацыйна-каштоўнаснага стаўлення педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Паказваецца залежнасць якасці адукацыйнага працэсу на нацыянальнай мове ад матывацыйна-каштоўнаснага стаўлення педагагічных работнікаў да дадзенай дзейнасці. Раскрываюцца асноўныя механізмы забеспячэння матывацыйна-каштоўнаснай накіраванасці педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі.

**Ключавыя словы:** дашкольная адукацыя; матывацыйна-каштоўнаснае стаўленне; нацыянальна-моўная адукацыя; педагагічныя работнікі.

© Трухановіч М. Э., 2022

Репозиторий БарГУ

**Trukhanovich Maria Eduardovna**
*Academy of Postgraduate Education, Minsk, the Republic of Belarus, marie29a@yandex.ru*

# MOTIVATIONAL AND VALUE ATTITUDE OF TEACHING STAFF TO NATIONAL LANGUAGE EDUCATION AS THE MAIN CONDITION FOR ENSURING ITS QUALITY

The article raises the problem of teachers' lack of a motivational and value attitude to the national language education of preschool children. The dependence of the quality of the educational process in the national language on the motivational and value attitude of teaching staff to this activity is indicated. The main mechanisms of ensuring the motivational and value orientation of teaching staff to national language education are revealed.

**Keywords**: preschool education; motivational-value attitude; national-language education; teaching staff.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Навучанне і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту арганізуюцца ва ўмовах блізкароднаснага (беларуска-рускага) білінгвізму і накіраваны у тым ліку на засваенне імі дзвюх дзяржаўных моў. Штогод на гэта звяртаецца ўвага педагагічных работнікаў і кіраўнікоў сістэмы дашкольнай адукацыі ў інструктыўна-метадычных пісьмах Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, у дачыненні да моўнай адукацыі на роднай мове на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь варта весці гаворку аб паўнавартаснай білінгвальнай адукацыі. Як складнік білінгвальнай адукацыі, нацыянальна-моўная адукацыя — гэта працэс навучання і выхавання, ён накіраваны на стварэнне аптымальных умоў для засваення выхаванцамі ўстаноў дашкольнай адукацыі беларускай мовы як часткі нацыянальнай культуры. Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь прадугледжвае мэтанакіраваную працу ў гэтым напрамку пасродкам уключэння ў змест Вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», мэтай якой з’яўляецца фарміраванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін выхаванцаў да беларускай мовы, жадання авалодаць ёю [1, с. 196, 429].

Дасягненне дадзенай мэты магчыма толькі пры наяўнасці ў кожнай установе дашкольнай адукацыі паўнавартаснага нацыянальна-моўнага асяроддзя, якасць якога ў вызначальнай ступень залежыць ад прафесійна-маўленчай гатоўнасці педагагічных работнікаў, якія яго ствараюць з мэтай маўленчага і лінгвістычнага развіцця выхаванцаў. Разам з тым кіраўнікі ўстаноў дашкольнай адукацыі адзначаюць наяўнасць праблемы ў выкарыстанні беларускай мовы педагагічнымі работнікамі падчас ажыццяўлення адукацыйнага працэсу. Асноўная прычына дадзенай праблемы — адсутнасць зацікаўленасці, унутранай матывацыі ў педагагічных работнікаў да ўжывання беларускай мовы і фарміравання пазітыўных адносін да яе ў выхаванцаў. Вызначаная праблема дэманструе неабходнасць вонкавага стымулявання педагагічных работнікаў з боку кіраўнікоў на якасную працу ў напрамку нацыянальна-моўнай адукацыі.

**Асноўная частка.** Вучоныя адзначаюць, што матывацыя з’яўляецца дэтэрмінантай паводзін у любой дзейнасці, у тым ліку прафесійнай. В. А. Слацелін, С. С. Кашлеў падкрэсліваюць, што матывацыйна-каштоўнасны кампанент, які складаецца з каштоўнасцей, асобасных установак і матываў прафесійнай дзейнасці, займае ў структуры асобы педагагічнага работніка цэнтральнае месца. Матывацыйна-каштоўнасны кампанент характарызуецца наступнымі паказчыкамі: стаўленне да прафесіі як каштоўнасці; разуменне і перажыванне яе значнасці як для грамадства, так і для ўласнага развіцця; цікавасць да педагагічнай дзейнасці і да кожнага кампанента і працэсу, якія яна ўтрымлівае; захопленасць гэтай дзейнасцю і імкненне да самаўдасканалення.

Гатоўнасць педагагічных работнікаў да маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей, удакладняе В. М. Макарава, будуецца на фарміраванні каштоўнасных арыенціраў адносна роднай мовы як формы выказвання нацыянальнай культуры, да дзіцяці і дзіцячага маўлення, уласнай ролі ў працэсе засваення выхаванцамі роднай мовы [2, с. 17].

Адпаведна службовым абавязкам педагагічныя работнікі, у прыватнасці, выхавальнікі дашкольнай адукацыі, павінны ствараць умовы для фарміравання ў дзяцей нацыянальнай самасвядомасці, далучаць іх да нацыянальнай культуры, яе традыцый [3, с. 31]. Менавіта нацыянальная мова з’яўляецца значнай часткай нацыянальнай культуры. Вучоныя адзначаюць, што нацыянальная мова выступае эфектыўным сродкам выхавання, з дапамогай якога выхаванцы далучаюцца да багатай культурнай спадчыны беларускага народа (Е. А. Андрэева, Дз. М. Дубініна, Т. У. Паліева, В. М. Смаль і інш.). Н. С. Старжынская разглядае працэс навучання роднай мове як інструмент фарміравання нацыянальна-моўнай культуры, які накіраваны на развіццё асобасна значных уяўленняў, разумення сістэмы каштоўнасцей уласнай лінгвакультурнай агульнасці [4, с. 7].

Нацыянальна-моўную адукацыю, якая павінна ажыццяўляцца на ўзроўні дашкольнай адукацыі адпаведна адукацыйнай праграме дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, неабходна разглядаць і як навучанне нацыянальнай мове, і як арганізацыю адукацыйнага працэсу, які ажыццяўляецца на нацыянальнай мове, адпаведна адукацыйнай праграме. Веданне нацыянальнай мовы і валоданне ёй педагагічных работнікаў, а ў першую чаргу іх асабістае стаўленне да яе, з’яўляюцца неабходнай умовай, без якой дзейнасць і ў тым, і ў другім кірунку немагчыма.

Адпаведна мэтам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі нацыянальна-моўная адукацыя грунтуецца ў асноўным на засваенні і фарміраванні адносін дзіцяці да нацыянальнай мовы як каштоўнаснага складніка нацыянальнай культуры. Н. С. Старжынская адзначае «Фактарам, які станоўча ўплывае на засваенне беларускай мовы як роднай, з'яўляецца выхаванне ў дзяцей цікавасці і прыязнага стаўлення да яе» [5, с. 3]. Відавочна, што якасную працу ў гэтым напрамку можа ажыццяўляць толькі педагагічны работнік, які сам лічыць нацыянальную мову як грамадскай, так і асабіста значнай каштоўнасцю. Такім чынам, у педагагічных работнікаў павінны быць сфарміраваны пэўныя пазітыўныя каштоўнасныя адносіны да нацыянальна-моўнай адукацыі. Яны выяўляюцца ў асэнсаваным дачыненні педагагічных работнікаў да мэтаў і вынікаў гэтай дзейнасці, у развіцці неабходных для яе ажыццяўлення лінгвістычных, лінгвадыдактычных ведаў і уменняў, адпаведных камунікатыўных здольнасцей. Гэта азначае, што дзейнасці педагагічных работнікаў павінна быць уласціва адпаведная матывацыйна-мэтавая накіраванасць на нацыянальна-моўную адукацыю. Толькі так можна забяспечыць дасягненне якасці нацыянальна-моўнай адукацыі адпаведна задач вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Трэба вызначыць, што якасць нацыянальна-моўнай адукацыі ў першую чаргу залежыць ад адносін педагагічных работнікаў да нацыянальнай мовы як сродку і мэты гэтай дзейнасці. А. У. Лянкевіч у даследаванні адносін да беларускай мовы вызначала іх як трохкампанентны комплекс: веды, эмоцыі і дзеянні [6]. З пункту гледжання адзначаных трох кампанентаў адносіны да нацыянальна-моўнай адукацыі таксама можна вылучыць як веды аб ёй, эмацыянальнае стаўленне да яе, непасрэдныя дзеянні па яе ажыццяўленні, якія грунтуюцца на асабістым стаўленні да нацыянальнай мовы. Гэтыя адносіны, адпаведна кожнаму з кампанентаў, будуць выяўляцца ў пэўных каштоўнасных арыентацыях і імкненнях, якія ўключаюць як жаданне валодаць нацыянальнай мовай, так і выкарыстоўваць яе ў адукацыйным працэсе з выхаванцамі, а таксама ў разуменні неабходнасці ўдасканальваць сваю кампетэнтнасць у кірунку лінгвістычнага і маўленчага развіцця выхаванцаў на беларускай мове.

На падставе вызначанай у працэсе аналізу навуковай літаратуры неабходнасці для прафесійнага развіцця матывацыйна-каштоўнаснай накіраванасці і ўліку кампанентаў адносін да беларускай мовы можна вызначыць, што для якаснага выканання задач маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту на дзвюх дзяржаўных мовах неабходна наяўнасць у кожнага педагагічнага работніка матывацыйна-каштоўнаснай накіраванасці на нацыянальна-моўную адукацыю.

Адпаведна аналізу навуковых крыніц можна вызначыць матывацыйна-каштоўнасную накіраванасць на нацыянальна-моўную адукацыю як якасць, абумоўленую ўнутраным разуменнем неабходнасці ведання беларускай мовы, як асабістай, так і грамадскай значнай каштоўнасці, якая выяўляецца ў патрэбе мець камунікатыўныя зносіны на ёй, у першую чаргу выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе з выхаванцамі, абумоўленым і ўзаемазалежным імкненнем удасканальваць сваю прафесійна-маўленчую гатоўнасць у дадзеным кірунку. Матывацыйна-каштоўнасная накіраванасць павінна забяспечыць гатоўнасць педагагічных работнікаў да рэалізацыі выхаваўчых задач нацыянальна-моўнай адукацыі, у першую чаргу фарміраванне каштоўнасных адносін да нацыянальнай мовы і на гэтай падставе матывацыю да яе засваення самімі педагагічнымі работнікамі, а таксама імкненне педагагічных работнікаў да якаснага ажыццяўлення адукацыйнага працэсу на ёй з выхаванцамі.

Для забеспячэння матываванасці педагагічных работнікаў на якаснае ажыццяўленне нацыянальна-моўнай адукацыі трэба аказваць непасрэднае кіраўніцкае ўздзеянне, якое павінна стымуляваць педагагічных работнікаў да адзначанай дзейнасці на падставе наяўнасці ў іх пэўных ведаў, уяўленняў, здольнасцей і каштоўнаснага стаўлення.

Па-першае, гэта прафесійна неабходныя веды, абумоўленыя патрабаваннямі асноўных нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць устаноў дашкольнай адукацыі: валоданне мэтамі і задачамі маўленчага і лінгвістычнага развіцця згодна са зместам адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі [1]; веданне вынікаў нацыянальна-моўнай адукацыі адпаведна патрабаванням да ўзроўню гатоўнасці выхаванцаў па адукацыйная галіне «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» у групах з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [7, с. 17—19]; веданне сваіх прафесійных абавязкаў у напрамку стварэння ўмоў для фарміравання ў дзяцей асноў патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, далучэння іх да нацыянальнай культуры, яе традыцый [3, с. 31].

Адзначаныя веды і ўяўленне павінны сфарміраваць дакладнае разуменне неабходнасці валодання нацыянальнай мовай для якаснага выканання прафесійных задач.

Па-другое, гэта стварэнне ўмоў для ўсведамлення педагагічнымі работнікамі ўсіх пераваг і магчымасцей, якія дае білінгвальнае навучанне і выхаванне для рознабаковага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Гэта будзе стымуляваць педагагічных работнікаў на выкарыстанне ў адукацыйным працэсе найлепшых сучасных падыходаў да маўленчага і лінгвістычнага развіцця выхаванцаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя на падставе ўпэўненасці ў тым, што засваенне дзвюх дзяржаўных моў дазваляе больш глыбока развіваць здольнасці выхаванцаў у розных напрамках. Вызначаныя веды і ўяўленні неабходна фарміраваць шляхам пастаяннага мэтанакіраванага метадычнага суправаджэння ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Рэпазіторый БарДУ

Па-трэцяе, неабходна стымуляваць удасканальванне якасці ажыццяўлення адукацыйнага працэсу на нацыянальнай мове з выкарыстаннем механізмаў кантрольна-дыягнастычнай функцыі кіравання. Асноўная задача кантрольна-дыягнастычнай функцыі — на падставе аналізу дзейнасці аказаць метадычную дапамогу педагагічным работнікам, вылучыць напрамкі, якія патрабуюць іх прафесійнага развіцця і самаўдасканалення, з мэтай павышэння якасці адукацыйнага працэсу. Такім чынам, матывацыйна-каштоўнасная накіраванасць стане падмуркам забеспячэння гатоўнасці педагагічных работнікаў да прафесійнага самаразвіцця і ўдасканалення сваіх прафесійных і маўленчых уменняў і навыкаў у кірунку нацыянальна-моўнай адукацыі.

Трэба адзначыць, што асоба кіраўніка ў значнай ступені паўплывае на матываванасць да дзейнасці супрацоўнікаў у пэўным кірунку. Таму вельмі важна, каб і самі кіраўнікі ўстаноў дашкольнай адукацыі былі прыкладам матываванасці да гэтай дзейнасці: з аднаго боку — як асноўныя супрацоўнікі ўстановы дашкольнай адукацыі, адказныя за якасць адукацыйнага працэсу, які будзе спрыяць рознабаковаму развіццю выхаванцаў, у тым ліку ў напрамку маўленчага і лінгвістычнага развіцця ў сітуацыі дзяржаўнага білінгвізму; з другога — як асоба — носьбіт нацыянальных каштоўнасцей, значнай часткай якіх з'яўляецца нацыянальная мова. Такім чынам можна будзе дасягнуць выканання задач нацыянальна-моўнай адукацыі, абумоўленых вучэбна-праграмнай дакументацыяй, і накіраваць дзейнасць педагагічнага калектыву на развіццё беларускага маўлення дзяцей як сродку камунікацыі і фарміраванне каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай мовы пасродкам стварэння ўмоў для далучэння выхаванцаў да яе як аднаго з асноўных механізмаў фарміравання асобы і пазнання нацыянальнай культуры.

**Заключэнне.** Фарміраванне матывацыйна-каштоўнаснага стаўлення педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі, у першую чаргу да беларускай мовы, з'яўляецца асноўнай неабходнай умовай для забеспячэння яе якасці. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі трэба праводзіць мэтанакіраваную працу па фарміраванні матывацыі да ўжывання беларускай мовы і ўдасканаленні якасці адукацыйнага працэсу. Асновай гэтай дзейнасці павінны стаць сфарміраваныя каштоўнасныя адносіны да нацыянальнай мовы як унікальнай крыніцы развіцця выхаванцаў і асноўнага складніка нацыянальнай культуры. Менавіта матывацыйна-каштоўнасная накіраванасць з'яўляецца асновай прафесійнага развіцця педагагічных работнікаў на аснове самааналізу прафесійна значных якасцей, ведаў і ўменняў, неабходных для ажыццяўлення нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Гэты матывацыйна-каштоўнасны кампанент прафесійна-маўленчай гатоўнасці ў сваю чаргу забяспечыць ініцыятыўнае самаразвіццё педагагічных работнікаў, накіраванае на ўдасканаленне прафесійных кампетэнцый, неабходных для якаснага вырашэння задач нацыянальна-моўнай адукацыі.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Об утверждении учебной программы дошкольного образования [Электронный ресурс] : постановление М-ва образования Респ. Беларусь от 15 авг. 2019 г. № 138 // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W21934601p&p1=1 . — Дата доступа: 03.01.2022.
2. *Макарова, В. Н.* Подготовка педагогов к речевому и лингвистическому развитию детей дошкольного возраста в системе непрерывного профессионального образования : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.08 / В. Н. Макарова. — Орел, 2011. — 44 с.
3. Об утверждении выпуска 28 единого квалификационного справочника должностей служащих [Электронный ресурс] : постановление М-ва труда и соц. защиты Респ. Беларусь от 29 июля 2020 г. № 69 // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22136368p&p1=1 . — Дата доступа: 03.01.2022.
4. *Старжынская, Н. С.* Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту / Н. С. Старжынская // Пралеска. — 2016. — № 10. — С. 3—8.
5. *Старжынская, Н. С.* Асновы развіцця беларускага маўлення і навучання роднай мове дашкольнікаў : аўтарэф. дыс. … д-ра пед. навук : 13.00.07 / Н. С. Старжынская ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. — Мінск, 1998. — 37 с.
6. *Лянкевіч, А. У.* Беларуская мова і змешаныя коды ў сацыялінгвістычным і псіхалінгвістычным аспектах: катэгорыя адносін да мовы ў грамадстве : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / А. У. Лянкевіч ; Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, 2014. — 25 с.
7. Об утверждении образовательного стандарта дошкольного образования [Электронный ресурс] : постановление М-тва образования Респ. Беларусь от 15 авг. 2019 г. № 137 // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/upload/docs/op/W21326737p_1363986000.pdf . — Дата доступа: 03.01.2022.


Репозиторий БарГУ